ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
"БЯРОЗАЎСКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА"
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ



## ЛІТАРАТУРНА-ФАЛЬКЛОРНЫ ФЭСТ

# "ЖЫВАЯ СПАДЧЫНА"



Да раённага Дня беларускага пісьменства
і Дня бібліятэк

## Сцэнарны матэрыял

*(Гучыць беларуская народная музыка. Гасцей сустракае Гаспадыня)*

**Гаспадыня:** Добры дзень, госцейкі дарагія! Вось і добра, што ўсе сабраліся разам, а то я вас ўжо зачакалася тут! Вітаю вас на нашым літаратурна-фальклорным фэсце "Жывая спадчына"! Так хацелася мне свята з вамі раздзяліць, ды не адно, а адразу ж некалькі – Дзень пісьменства і Дзень бібліятэк, а таксама сёння святкуеца Галавасек (Усячэння Галавы Святога Іаана Хрысціцеля). У гэты дзень забаранялася есці скаромнае, а таксама ўжываць у страву круглыя плады, каб не быць падобнымі да Ірадыяны, якая забаўлялася галавою Іаана Хрысціцеля бы яблыкам. Верылі, што з цягам году адсечаная галава прырастае да свайго месца, таму ў гэты дзень стараліся не карыстацца нажамі і сякерамі (нават хлеб ламалі рукамі ці наразалі лустамі загадзя). Калі ж варылі бацвінне, пазбягалі чырвонага, баючыся, што цягам году ў доме праліецца чыя-небудзь кроў. На Палессі на Івана Галавасека (Калінавага Івана) ламалі каліну і варылі кісель, каб увесь год не балела галава.

*(Заходзіць суседка)*

**Суседка:** Добры дзень, даражэнькая гаспадыня! Мір твайму дому, быць пірагу ядому! *(Глядзіць у розныя бакі, бачыць, што шмат людзей вакол)* Ой, а чаго ж гэта столькі народу ў цябе? Добры дзень і вам, людзі добрыя! Весялосці вам і радасці*!*

**Гаспадыня:** Добры дзень, суседачка! Дык вось я госцейкам сваім і кажу, што надвор'е цудоўнае і дзень святочны – так чаму ж нам не пагуляць такой кампаніяй ды спадчыну нашу не ўзгадаць?

**Суседка:** Так так, цікава… А танцы з песнямі будуць?

**Гаспадыня:** Ну а як жа! Вось танцам "Я люблю Беларусь!" мы і адчынім наша свята! А выканае яго для нас дзіцячы танцавальны гурток Пескаўскага СДК "Красуні"!

*(Танец "Я люблю Беларусь")*

**Суседка:** Ах, як жа хараша танцуюць, як жа ладна! Нейкі цуд дзеецца!

**Гаспадыня:** Да, у нашай мясцовасці ўсе таленавітыя! Бывае нават так: як да жніва, то ледва жыва, а як да танцу, то "мой каханцу"!

**Суседка:** *(Смяецца)* І адкуль ты толькі такія прыказкі ведаеш, суседачка?

**Гаспадыня:** Я яшчэ і не такое ведаю! Вось, напрыклад, магу сказаць, што заўтра будзе моцны вецер.

**Суседка:** А гэта яшчэ як? Такая ты разумная?
**Гаспадыня:** Ды прыкмета ёсць народная: калі вераб'і ператятаюць з месца на месца, чакай моцнага ветру.
**Суседка:** Хм… Не чула такога. Так дзе ж ты гэта ўсё бярэш?
**Гаспадыня:** А ці ты не ведаеш? Госцейкі дарагія, а вы?

*(Усе адказываюць: ці ведаюць, што ў кнігах; ці не ведаюць)*

**Гаспадыня:** Так, у кнігах па этнаграфіі і фальклору! У мяне іх шмат для маіх чытачоў. Каб не страцілася наша спадчына. Вяртацца да старога ўкладу жыцця ці уздыхаць па старых рэчах, канечне, не варта. Але ведаць, як жылі нашы дзяды-прадзеды трэба, каб не рвалася па-жывому кроўная сувязь пакаленняў.
**Суседка:** Так ты можа нам усім пакажаш некалькі такіх цудоўных кніжак?
**Гаспадыня:** Абавязкова! Падыходзьце сюды, калі ласка!

*(Кароткі (5 хвілін) агляд кніжнай выставы "Да родных вытокаў".*
*Праводзіць Гаспадыня фэста)*

**Суседка:** Колькі ўсё ж такі цікавага ў кнігах пішуць! Вось мне, напрыклад, пра віды народнага мастацтва вельмі цікава чытаць заўжды. Ёсць у мяне мара – навучыцца, як бабуля мая, птушак і кветкі з паперы рабіць…
**Гаспадыня:** Так за чым рэч стала? Ты ж пра выцінанку гаворыш, а ў мяне як раз у гасцях сяброўка з залатымі рукамі! Яна нас зараз усяму навучыць!

*(Майстар-клас па вырабу выцінанкі і бранзалетаў. Пескаўская СБ)*

**Суседка:** Ой, дзякуй вялікі вам, дарагія мае, што мару маю здейсніць дапамаглі. Дык яшчэ ж якое цудоўнае ўпрыгожванне рабіць навучылі! Мне ўсе зайздросціць будуць! *(Верціць рукою з бранзалетам)*
**Гаспадыня:** Ну так шмат крам раней не было, а прыбірацца дзяўчыны заўжды вельмі любілі. А адзенне? Ведаеце, як адзенне рабілі? Спачатку на кроснах ткалі палотны, а вясной неслі на рэчку бяліць. Там яго мылі, адбівалі, а потым на беразе расцілалі, каб сонейка яго выбеліла. Вось з таго палатна шылі кашулі і сукенкі, вышывалі іх ніткамі каляровымі. Спадніцы таксама яркія былі: у клетку альбо папярэчныя палосы ў чырвона-сіне-зяленым каларыце. А паверх фартухі адзявалі, вышытая кветкамі ці арнаментам.
**Суседка:** О! Загадка па тэме: Першы канец у жываце, а другі на верхнім кальцы, каб першы канец дастаць, трэба ўсе кольцы зняць. (*Клубок нітак*)
Ну, хто ведае, што гэта?

*(Гучаць адказы)*

**Гаспадыня:** У наш час дзяўчыны таксама майстрыхі на ўсе рукі! Зараз мы з вамі ў гэтым пераканаемся. Сустракайце юных прыгажунь!

*(Дэфіле)*

**Суседка:** Прыгажуні! Чым яшчэ парадуеш, гаспадыня?

**Гаспадыня:** Ну так самы ж час пагуляць! Згодны? Ведаю я дзяўчыну, якая шмат народных гульняў ведае! Хадземце, я вас зараз пазнаёмлю.

*(Гульні праводзіць Вікторыя К)*

**Суседка:** Так гулялі, так скакалі, аж горача стала! Зараз бы газіровачкі якой небудзь…

**Гаспадыня:** Ты што гаворыш такое! Якая газіровачка? Ад яе ж паўнеюць! Я зараз цябе карысным напоем пачастую. Вось адгадайце, кемлівыя маі: возьмеш – чорна, нальеш – горка; пан крычыць: "Салодка". Мужык крычыць: "Гадка!" *(чай)*

**Суседка:** Мая маці распавядала, што жанчыны ў нашым родзе заўсёды збіральніцтвам займаліся, а гарбата травяная ў іх была самая смачная! Я і сама сёе-тое ўмею… Так давай паглядзім, можа, я ў цябе яшчэ чаму-небудзь навучуся.

*(Дэгустацыя фітачая)*

**Суседка:** Ой, а пра песні – асалоду душы, ты забыла?

**Гаспадыня:** Ну ты што, як можна забыць такое. Сустракайце народны ансамбль народнай песні "Пескаўскія весялухі"!

*(выступ - 2 песні)*

**Суседка:** А гэта што ў цябе за запісачкі тут?

**Гаспадыня:** А вось зараз я растлумачу. Дарагія мае, запрашаю вас у нашы забаўляльныя зоны! У фотафолькзоне можна ўявіць сябе кім-небудзь іншым і зрабіць фотаздымак, у фолькзагадкавай зоне праявіць сваю кемлівасць, а ў фолькгульнёвай зоне вы можаце пахадзіць на хадулях і пакатацца на арэлях!
А мы з вамі хоць і развітваемся і жадаем вам дабрабыту ў кожнай хаце, міру і шчасця назаўжды і ніякае бяды, а свята наша працягваецца! З радасцю запрашаю вас паслухаць чароўныя галасы нашых "Пескаўскіх весялух" і пазабаўляцца ў фолькзонах!

**Суседка:** Да новых сустрэч!

*(Выступ "Пескаўскіх весялух", работа фолькзон)*

# ДАДАТАК 1
# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ
# ГУЛЬНІ

*(праводзіць Пескаўская СБ)*

*Беларускія народныя гульні садзейнічаюць замацаванню ў свядомасці асобнага чалавека ўсёй разнастайнасці вобразаў і знакаў культуры, якія ўвайшлі ў поле грамадскай свядомасці. Маючы дачыненне да з'яў і прадметаў прыроды, гуляючы, міфалагізуючы і практычна выкарыстоўваючы прыроду, чалавек набліжаецца да спасціжэння яе сутнасці. Традыцыі гульнявой культуры выступаюць, такім чынам, умовай развіцця ўнутранай псіхалагічнай прасторы асобы, фарміруюць яе ўнікальны патэнцыял.*

1. **Шавец**

Гулялі хлопчыкі і дзяўчынкі. Лік удзельнікаў – 3-8 чалавек. Яны выбіралі вядучага – "шаўца". І сядалі вакол яго на зямлю. "Шавец" маляваў палачкай на зямлі якія-небудзь прадметы: кветачку, хату, дрэва і г.д. Астатнія ўдзельнікі павінны былі здагадвацца, што малюе "шавец", і паўтараць яго малюнак. Той, хто памыляўся, выбываў з гульні.

2. **Талкуючыкі**

На зямлі чарцілі круг дыяметрам 3 м. У яго станавіліся два хлопцы. Яны закладывалі рукі за спіну і стараліся плячом, галавой ці грудзямі вытаўкнуць адзін аднаго з гэтага круга. Той, хто пераступіць мяжу, выбывае з гульні.

3. **Хто адарвецца – гуркі краў**

У гульні ўдзельнічае любая колькасць чалавек. Яны становяцца "шнурком" адзін за адным і злучаюць унізе рукі. Паперадзе, тварам да гурту, - фізічна моцны ці старэйшы за іншых гулец. Узяўшы за руку першага ў калоне хлопца (можа быць і дзяўчына), ён закручвае ўсіх у розныя адмысловыя фігуры, ды так, каб разбурыць "шнурок" – "чым хутчэй, тым цікавей". Таму, бегаючы, рэзка мяняе напрамак руху. Задача гульцоў, асабліва апошняга, утрымацца, "не зляцець з арбіты". Хто адарвецца, той і гуркі краў. Гульня пачынаецца спачатку.

## 4. Рэдзька

Некалькі дзяўчат становяцца, трымаючыся за пояс адна адну. Адзін з хлопцаў назначаецца “агароднікам”, які ходзіць вакол дзяўчат, шчыпае іх, штурхае, б’е палкай па нагах і г.д., робячы выгляд, што поле рэдзьку, абкапвае, палівае і інш. Адна дзяўчына назначаецца “панею”. Сядае ў куце на лаўку і пасылае свайго слугу (заўсёды здаровага хлопца) за рэдзькаю. Хлопец, падышоўшы да агародніка, гаворыць: “Добры вечар, ці пусціш рэдзьку рваць. Пані захварэла – рэдзькі захацела”. Агароднік адказвае: “Мая рэдзька каранiстая, маладзістая. Рві, калі вырвеш”. Слуга пачынае штурхаць дзяўчат, тыя ўпіраюцца, пакуль яму нарэшце ўдаецца выцягнуць адну з раду. Затым ён вядзе “рэдзьку” да пані і тая да таго часу шчыпае “рэдзьку”, пакуль тая не дасць выкуп у выглядзе арэхаў, арбузных семак або чаго іншага. І так працягваецца гульня, пакуль слуга не выцягне ўсю рэдзьку. Гэтая гульня таксама заканчваецца песнямі і скокамі.

## 5. Кароль

Кожны ўдзельнік гульні збірае па 24 невялікія, велічынёю з фасоліну, каменьчыкі. Усе яны сыплюцца ў агульную кучу. Хто-небудзь з гульцоў бярэ з яе “ў жменю” столькі каменьчыкаў, колькі іх можа там змясціцца. Падкідвае ўверх і ловіць затым верхнім бокам кісці рукі. Злоўленыя каменьчыкі зноў падкідваюцца ўверх і ловяцца ў далоню. Што пападзе ў далонь, тое лічыцца канчатковым і кладзецца ўбок, і гулец зноў пачынае выконваць тую ж працэдуру. Калі здарыцца, што ён не зловіць ніводнага каменьчыка або зловіць толькі адзін, то права лавіць пераходзіць да наступнага гульца, і г.д. Хто з гульцоў першы зловіць свае 24 каменьчыкі, той застаецца “каралём”, і гульня лічыцца скончанай.

## 6. Чарвяк

З усіх гульцоў выбіраюцца двое, з якіх адзін – “чарвяк”, а другому даецца ў рукі палачка. Астатнія становяцца ў круг. Гульня пачынаецца з таго, што “чарвяк абтачываець” круг, г. зн. Абходзіць яго, віхляючыся і крыўляючыся. Той, у каго палачка, стараецца стукнуць “чарвяка”, але яго можна біць толькі тады, калі знаходзіцца па-за кругам. Таму “чарвяк” павінен як мага часцей выбягаць з круга, а таксама павінен завіхацца каля гульцоў. Калі “чарвяка” “уб’юць” палачкай, то за ім ідзе ў круг той, хто гэта здолеў зрабіць. А палпчку бярэ хто-небудзь з гульцоў, і гульня працягваецца.

**7. Прыпеўка**

Гулялі толькі дзяўчаты. Усе садзіліся на лаўку. Супраць іх стаяла вядучая. Яна гаварыла ім якое-небудзь слова, а тыя павінны былі ўспомніць прыпеўку (песню), у якой гэтае слова сустракаецца. Тая дзяўчына, якая ўспамінала першай, пела прыпеўку і выходзіла з гульні. Тая дзяўчына, якая заставалася апошняй, павінна была спець 5 або 10 прыпевак.

**8. Пічымыся-лічымыся (Конь)**

Садзяцца ўсе гульцы на “лаве” і кладуць складзеныя ўнутр далонямі рукі на калені. Адзін з іх (па выбару) падыходзіць па чарзе да кожнага са сваіх сяброў, кладзе ў яго рукі свае, нібы нешта дае, і пры гэтым гаворыць па слову: “Пічымыся-лічымыся, куды нам пайці? У пятровіцы, лядовіцы – сушчык, лушчык, пень, гвач, гарлач, прэч, запяк”. На кім прыйдзецца слова “запяк”, той ідзе да дзвярэй і становіцца там, узяўшыся за дзвярную ручку. Той, хто гаварыў гэтую тыраду, абыходзіць кожнага гульца і пытаецца, якой масці каня ён будзе (які конь?). Кожны гулец звычайна павінен выбраць сабе масць. Пасля гэтага той, хто стаіць ля дзвярэй, гаворыць: “Прадайця каня!” У яго пытаюцца: “Якога?” Ён называе масць. Калі пры гэтым ён патрапіць на чыю-небудзь масць, то той павінен прынесці яго на ранейшае месца; калі ж нічыя масць не будзе адгадана, то ён скача да месца на адной назе.

**9. Памідор**

Вылічаны сярод дзяцей “памідор” абавязаны быў рассмяшыць асобу, да якой падыходзіў і гаварыў самыя дзіўныя рэчы. Другая асоба ў сваю чаргу на кожнае пытанне, кожную рэпліку адказвала з павагай: “Памідор”. Калі не ўдалося рассмяшыць першага гульца, “памідор” працягваў размову з кім-небудзь іншым. Той, хто засмяяўся, даваў фант. Сабраныя фанты ў канцы гульні выкуплялі.

# ДАДАТАК 2
# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ
# ЗАГАДКІ

1. Пятро бяжыць, а варона крычыць.*(Воўк)*
2. Лезу, лезу, не залезу, дай, кажа, перарэжу. *(Мёд)*
3. Нясу крывулічку ды ў тую вулічку.*(Лыжку ў рот)*
4. Не куст, а з лісточкамі, не чалавек, а расказвае. *(Кніга)*
5. Хата кругом свеціцца. (*Кошык)*
6. Складзеш – клін, развернеш – блін. *(Парасон)*
7. Увесь свой век ходзіць, а з месца не сыходзіць. *(Гадзіннік)*
8. З акна ў акно – залатое верацяно. *(Сонечны прамень)*
9. Як паставіць чатыры салдаты ў адным боце?
   *(Зняць у кожнага па аднаму боту)*
10. Рота няма, а зубы маюцца. *(Граблі)*
11. Без дарожак і без ножак, а бяжыць, як толькі можа. *(Рэха)*
12. Едзе кошка на шасці ножках, сама сёмая. *(Тыдзень)*
13. Не разаб’еш гаршчок, то не з’ясі і кашы. *(Арэх)*
14. Бяжыць зайчык, ушчаміў хвосцік у плоцік. *(Іголка з ніткай)*
15. Бела кабыла ўсе дровы павазіла. *(Печ)*
16. Стаіць сасна, на сасне лён, на льне жыта. *(Стол, абрус, хлеб)*
17. Хоць у капелюшы, а галавы не мае. *(Грыб)*
18. Яго б’юць, а ён не плача. *(Мячык)*
19. Хто з барадой родзіцца? *(Казёл)*
20. Без рук, без сякеры зроблена хата і дзверы. *(Гняздо)*

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**


1. Анталогія беларускай народнай прыказкі, прымаўкі і выслоўя / уклад. А.С. Фядосік. – Мінск : Ураджай, 2002. – 298 с.
2. Беларускі фальклор : матэрыялы і даследаванні. Вып. 3. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – 519 с.
3. Беларускі фальклор : хрэстаматыя / склад. К.П.Кабашнікаў і інш. – 4-е выд. – Мінск : Вышэйшая школа, 1996. – 856 с.
4. Валодзіна, Т.В. “Ядранае жыта гаспадара кліча…” : каляндарны год у абрадах і звычаях / Т.В. Валодзіна, Т.І. Кухаронак. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 356 с. – (Традыцыйны лад жыцця)
5. Гульні, забавы, ігрышчы. – 3-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 534 с. – (Беларуская народная творчасць)
6. Дучыц, Л.У. Сакральная геаграфія Беларусі : [археалагічныя раскопкі, этнаграфічные і фальклорные экспедыцыі]. - Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. - 382 с.
7. Загадкі / НАН Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 363 с. - (Беларуская народная творчасць)
8. Запрашаем на вячоркі : сцэнарый свята // Бібліятэка прапануе. – 2017. - № 5. – С. 30-33
9. Легенды і паданні. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с. – (Беларуская народная творчасць)
10. Макарцоў, М.Ф. Беларусь святкуе : сцэнарыі народных свят і абрадаў. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2000. – 132 с.
11. Макарцоў, М. Тэатр мой – Беларусь святочная : сцэнарыі, рэжысёрскія нататкі. - Гомел– : Барк, 2009. – 295 с.
12. Пасля кірмашу : літаратурна-музычная праграмма // Да юбілейных вечарын. – Мінск : Красіка-Парынт, 2003. – С. 89-94
13. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 415 с.

14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Том 4. Брэсцкае Палессе. Кн. 2. – Мінск : Вышшэйшая школа, 2009. – 863 с.
15. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Том 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. Кн. 2. – Мінск : Вышэйшая школа, 2013. – 1231 с.
16. Хадзі, хадзі, песня родная, к нам у святліцу // Да юбілейных вечарын. – Мінск : Красіка-Парынт, 2003. – С. 110-119
17. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына : Беларусь. Краіна і людзі. - Мінск : Беларусь, 2001. - 208 с.
18. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына : Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. - Мінск : Беларусь, 2001. - 207 с.






Пятро бяжыць, а варона крычыць.




МАЯ
ВЫЦІНАНКА






"ЛЕКАВЫ ВОДАР"
"БАДЗЁРАСЦЬ"
ВОДАР







